на праграма, якая дазваляе пашырыць веды навучэнцаў па гэтым пытанні.

Усе вышэйназваныя праблемы мы праводзім праз разнастайныя формы работы: урокі, практычныя заняткі, вучэбную і вытворчую практыку.

Праблемай нашай работы з'яўляецца немагчымасць набыцця многіх вельмі неабходных расійскіх выданняў па пытаннях бібліятэчнай працы.

С.В. ЗЫГМАНТОВІЧ

## БЕСПЕРАПЫННАЯ БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ПАДРЫХТОЎКА СТУДЭНТАЎ У СІСТЭМЕ "КАЛЕДЖ – ВНУ"

На сучасным этапе ў бібліятэчнай адукацыі адбываюцца значныя змены: на практыцы рэалізуецца сістэма шматузроўневай падрыхтоўкі бібліятэкараў (ствараюцца каледжы пры ВНУ, якія працуюць на падставе агульных або ўзгодненых вучэбных планаў; у ВНУ ўводзіцца двухузроўневая сістэма адукацыі ў складзе бакалаўрыяту і магістрату); аднаўляецца змест адукацыі пад уплывам інфарматызацыі і камп'ютэрызацыі бібліятэк; пашыраецца наменклатура спецыялізацыі, ўводзяцца падвойныя спецыяльнасці і інш. Па сутнасці, ідзе рэформа прафесійнай бібліятэчнай адукацыі. Але ў многім яна мае стыхійны характар, і гэта выяўляецца ў недастатковасці яе канцэптуальнай распрацоўкі, вывучэння патрэб практыкі. Доўгі час на пасяджэннях круглых сталоў, навукова-практычных канферэнцыях ішла размова аб неабходнасці навукова абгрунтаванай канцэпцыі развіцця сістэмы падрыхтоўкі бібліятэкараў у Рэспубліцы Беларусь, іншых нарматыўных актаў – дзяржаўных нарматыўных стандартаў,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кваліфікацыйных характарыстык.

Але, на жаль, гэтыя праблемы застаюцца актуальнымі і па сённяшні дзень. Для іх вырашэння, магчыма, трэба было б стварыць спецыяльную камісію, якая б пад кіраўніцтвам камітэта па адукацыі Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі распачала б гэтую работу.

Патрабуюць абгрунтавання перспектыўныя прагнозныя планы, звязаныя з увядзеннем на факультэце розных спецыялізацый. Цяпер на ФБІС студэнтаў рыхтуюць па 11-ці спецыялізацыях. Прапаноўваюцца дадатковыя як з боку практыкаў, так і выкладчыкаў: бібліятэкар-адміністратар баз даных, бібліятэкар-тэхнолаг АБІС і інш. На маю думку, перспектыўнай і неабходнай для бібліятэчнай справы рэспублікі з'явілася б падрыхтоўка студэнтаў па спецыяльнасці "бібліятэкар-бібліёграф-педагог па інфармацыйнай культуры". Праблема інфармацыйнай падрыхтоўкі карыстальнікаў у перыяд пабудовы інфармацыйнага грамадства будзе набываць усё большую актуальнасць.

Ужо сёння адбываецца інфарматызацыя працэсу навучання ў сістэме сярэдняй, вышэйшай і паслядыпломнай адукацыі, уводзяцца ў школах такія дысцыпліны, як "Асновы інфармацыйнай пісьменнасці школьніка", "Асновы інфарматыкі", "Інфармацыйная культура асобы". Выкладанне спецыяльных прадметаў адбываецца з арыентацыяй на высокі ўзровень інфармацыйнай падрыхтоўкі навучэнцаў.

Усё гэта робіць актуальнай задачу падрыхтоўкі педагагічных кадраў інфармацыйнага профілю.

Бібліятэкары маюць багаты вопыт работы па прапагандзе бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў сярод розных груп карыстальнікаў. У бібліятэках змест гэтай работы пашыраецца над уплывам аб'ектыўных умоў – укаранення



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

новых інфармацыйных тэхналогій, прадастаўлення магчымасці самім карыстальнікам працаваць з электроннавылічальнымі сродкамі ў працэсе пошуку неабходнай інфармацыі. Таму на факультэце ёсць рэальныя падставы распачаць работу па падрыхтоўцы бібліятэкараў, якія маглі б і выкладаць дысцыпліны інфармацыйнага цыкла ў навучальных установах, і ўзбагаціць гэтую работу ў саміх бібліятэках. Засваенне студэнтамі новай спецыяльнасці будзе прадугледжваць авалоданне імі сучаснымі інфармацыйнымі тэхналогіямі, методыкай выкладання курсаў, прысвечаных фарміраванню інфармацыйнай культуры асобы, арганізацыяй вучэбнага працэсу, рознымі формамі навучання і інш. Вопыт падрыхтоўкі бібліятэкараў з дадатковай педагагічнай спецыяльнасцю ўжо на факультэце ёсць, і трэба адзначыць, што менавіта магчымасць атрымаць у працэсе навучання дзве спецыяльнасці з'яўляецца вельмі прывабнай для студэнтаў, аб чым сведчаць і вынікі конкурсу на гэтыя спецыяльнасці, і апытанне саміх студэнтаў.

Нарматыўнымі дакументамі для выкладчыкаў як універсітэта, так і каледжа з'яўляюцца вучэбныя планы. Можна гаварыць, што сумеснае навучанне студэнтаў у сістэме "каледж – ВНУ" дазволіў правесці апрабацыю агульных навучальных планаў, убачыць іх хібы. Вырашэнне іх павінна ісці сумеснымі намаганнямі выкладчыкаў універсітэта і каледжа. Трэба актыўней развіваць навуковаметадычнае супрацоўніцтва шляхам правядзення сумесных пасяджэнняў цыклавых камісій каледжа і спецыяльных кафедраў, прадметна-метадычных камісій універсітэта, сумесных навукова-метадычных канферэнцый, спецыяльных пасяджэнняў савета ФБІС. Магчымае таксама і стварэнне вучэбна-метадычнага аб'яднання, куды б уваходзілі стар-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шыні ўсіх цыклавых і прадметна-метадычных камісій, для агульнай каардынацыі дзеянняў, сумеснай распрацоўкі планаў, абмеркавання праграм вучэбных дысцыплін, правядзення маніторынгу якасці рэалізацыі планаў і праграм. Добрай формай павышэння кваліфікацыі магла б з'явіцца і такая, як арганізацыя стажыровак для выкладчыкаў каледжа на факультэце, што дало б магчымасць больш актыўна развіваць нефармальныя зносіны паміж выкладчыкамі.

Адной з актуальных з'яўляецца праблема пераемнасці ў навучанні і, адпаведна, дубліравання матэрыялу ў выкладаемых курсах як у сістэме "каледж – ВНУ", так і паміж курсамі, выкладаемымі ва універсітэце. Спробы пабудаваць сістэму падрыхтоўкі бібліятэкараў новага тыпу зыходзячы з прынцыпаў так званага "здаровага сэнсу", калі асноўныя рашэнні па складзе і напаўненні вучэбнага плана прымаюцца па прынцыпу "зняць – дадаць" (маецца на ўвазе колькасць гадзін на тыя ці іншыя дысцыпліны), якія да сённяшняга дня маюць распаўсюджанне, відавочна, што поспеху не прынясуць. Трэба іншыя падыходы.

У якасці прыклада возьмем такую дысцыпліну, як "Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы ў бібліятэцы". Гэтая дысцыпліна выкладаецца ў Мінскім лінгвістычным каледжы. Галоўная мэта яе выкладання – даць студэнтам магчымасць авалодаць ведамі, практычнымі навыкамі і ўменнямі ажыццяўлення бібліяграфічных працэсаў і аперацый ва ўмовах публічных бібліятэк. Ва універсітэце ў вучэбны план уключаны курс "Тэхналогіі бібліяграфічнай дзейнасці". Галоўнуя мэта дадзенага курса бачыцца ў тым, каб студэнты добра засвоілі асноўныя кампаненты тэхналагічных рэсурсаў бібліяграфічнай дзейнасці, навучыліся кіраваць тэхналагічнымі рэсурсамі, раскладваць тэхналагічныя працэсы на аперацыі, карыстацца і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

самім складаць тэхналагічныя карты, блок-схемы, ажыццяўляць нарміраванне бібліяграфічных працэсаў і аперацый, шукаць шляхі рацыяналізацыі і аптымізацыі бібліяграфічных працэсаў, правільна вызначаць неабходныя сродкі для ажыццяўлення розных накірункаў бібліяграфічнай дзейнасці, вызначаць эфектыўнасць бібліяграфічнай дзейнасці і якасць бібліяграфічных прадуктаў і паслуг, новыя віды і формы бібліяграфічных паслуг, распрацоўваць нарматыўныя, тэхналагічныя і метадычныя дакументы, накіраваныя на забеспячэнне бібліяграфічнай дзейнасці ў бібліятэках.

Засваенне курса вышэйшых навучальных устаноў немагчыма без валодання навыкамі выканання асноўных працэсаў і таму, з аднаго боку, выкладчык імкнецца абапірацца на атрыманыя студэнтамі ў каледжы веды, а з другога, – відавочна, што не ўсе студэнты аднолькава добра засвоілі тэхналогію выканання асобных відаў, накірункаў дзейнасці. І гэта абумоўлівае неабходнасць паўтараць пэўны матэрыял ці ў скарочаным выглядзе, ці, наадварот, паглыбляючы веды студэнтаў, ці праводзіць гэтае паўтарэнне ў выглядзе гутаркі са студэнтамі, калі яно неабходнае, дзеля таго каб засвоіць новы матэрыял. Таму не трэба так адмоўна ставіцца да пэўнага дубліравання матэрыялу ў выкладаемых дысцыплінах у каледжы і універсітэце. Яно бывае аб'ектыўна неабходным, але, безумоўна, павінна быць абгрунтаваным.

Пры выкладанні курса "Тэхналогіі бібліяграфічнай дзейнасці" атрыманая ў каледжы прафесійная падрыхтоўка студэнтаў улічваецца і пры правядзенні лабараторных і практычных заняткаў. Ва універсітэце вялікая ўвага надаецца выкарыстанню новых актыўных формаў правядзення лабараторных, практычных заняткаў з элементамі навуко-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вай, даследчыцкай працы (дзелавыя гульні, вучэбныя дыскусіі, экспрэс-апытанне).

Актуальнай праблемай пры выкладанні як агульных, так і галіновых бібліяграфічных курсаў з'яўляецца выкарыстанне ў вучэбным працэсе новых аўтаматызаваных інфармацыйных тэхналогій. Пры вывучэнні курса "Тэхналогіі бібліяграфічнай дзейнасці" студэнты набываюць практычныя навыкі фарміравання ў аўтаматызаваным рэжыме такога бібліяграфічнага прадукту, як сістэматычная картатэка артыкулаў, праводзяць бібліяграфічны пошук у аўтаматызаваным рэжыме па інфармацыйных рэсурсах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Распрацавана і апрабіравана методыка правядзення заняткаў, прысвечаных падрыхтоўцы бібліяграфічных дапаможнікаў у аўтаматызаваным рэжыме. На жаль, праблем больш, чым дасягненняў, і сярод гэтых праблем такія, як матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне заняткаў, складанасці ў распрацоўцы самога зместу заняткаў, забяспечанасць іх рэальна існуючымі базамі даных і інш. Магчымым і неабходным для студэнтаў, якія закончылі каледж, было б увядзенне ва універсітэце спецыяльнага курса "Аўтаматызацыя бібліяграфічных працэсаў". Тады б курс "Тэхналогіі бібліяграфічнай дзейнасці" ў тым выглядзе, як ён выкладаецца ва універсітэце, з'явіўся б лагічным завяршэннем засваення студэнтамі традыцыйнай і аўтаматызаванай тэхналогій выканання бібліяграфічных працэсаў і авалодання навыкамі кіравання бібліяграфічнымі тэхналогіямі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ